# 8 ГЕНДАРНАЯ АСІМЕТРЫЯ І ГЕНДАРНЫЯ СТЭРЭАТЫПЫ Ў ТВОРАХ Я.СІПАКОВА І У.АРЛОВА

1 Кніга Я.Сіпакова «Жанчына сярод мужчын»: назва кнігі і гендарная асіметрыя.
2 Абагуленае «жанчына» ў кнізе Я.Сіпакова  і «іншае» С. дэ Бавуар.
3 Жанчына-ідэал у аповесці У.Арлова «Краявід з ментолавым пахам».
4 Тоеснасць паняццяў «ідэальнасць» і «сексуальнасць» у дачыненні да галоўнай гераіні аповесці У.Арлова.

## 1 Кніга Я.Сіпакова «Жанчына сярод мужчын»: назва кнігі і гендарная асіметрыя.

Кніга Я.Сіпакова «Жанчына сярод мужчын» – свядомая спроба мужчыны разабрацца ў «жаночай сутнасці». У гэтай кнізе прадстаўлены пераважна нешчаслівыя жаночыя лёсы. Іх няшчасці пісьменнік звязвае з неўладкаваным асабістым лёсам, падкрэсліваючы тым самым залежнасць жанчын ад моцнай паловы чалавецтва і перавагу іх асабістага жыцця над іншымі сферамі дзейнасці. Тут мэтазгодным будзе ўзгадаць высновы сусветнавядомага псіхааналітыка першай паловы XX ст., агульнапрызнанага заснавальніка навукі пра жаночую псіхалогію Карэн Хорні. Як вынікае з яе знакамітай кнігі «Жаночая псіхалогія», адзін з амаль непазбежных вытокаў расчаравання і недаверу «ў нармальным любоўным жыцці», заключаецца ў тым, што сама напружанасць пачуцця кахання ажыўляе ўсе нашыя схаваныя чаканні і надзеі на шчасце, што спяць глыбока ўнутры кожнага з нас. «Усе нашыя падсвядомыя жаданні, супярэчлівыя па сваёй прыродзе і бязмежныя па зместу, чакаюць свайго здзяйснення менавіта ў каханні. Наш партнёр павінен быць моцным і ў той жа час бездапаможным, весці і быць вядомым, быць аскетычным і пачуццёвым адначасова. Ён павінен згвалтаваць нас і застацца пяшчотным, прысвячаць увесь свой час толькі нам і напружана займацца творчай працай. Пакуль мы лічым, што ён сапраўды можа выканаць усё гэта, ён акружаны арэолам сексуальнай пераацэнкі. Мы прымаем моц гэтай пераацэнкі за моц нашага кахання, але, на самой справе, толькі дэманструем напружанасць нашых жаданняў, таму што сама прырода гэтых патрабаванняў робіць іх такімі, якія нельга выканаць. З гэтымі расчараваннямі мы яшчэ можам больш ці менш паспяхова  справіцца (кантраляваць іх). Пры спрыяльных умовах мы можам ніколі не даведацца пра большасць з іх, таксама як звычайна не здагадваемся пра ступень нашых таемных чаканняў. Але ў нас застаюцца сляды недаверу, як у дзіцяці, які даведваецца, што дастаць зоркі з неба тата ўсё ж такі не можа». Такія погляды на жыццё і каханне, як вынікае з кнігі, уласцівыя абодвум полам, а не толькі жаночай палове чалавецтва, як прынята лічыць. Хаця, магчыма, жанчынам у большай ступені. І гэта можа быць звязана усё з той жа сацыяльнай неўладкаванасцю жанчын, дыскрымінацыяй па прыкмеце полу, а не псіхафізіялагічнымі адметнасцямі жанчыны. Дададзім ад сябе, што спраўджанасць жыцця чалавека (без падзелу па полавай прыкмеце), яго шчасце, асабліва ў наш нестабільны час, не можа і не павінна асацыявацца толькі з каханнем. Ставіць знак роўнасці паміж гэтымі катэгорыямі, значыць збядняць сваё жыццё, свядома рабіць з сябе ахвяру. Гэта варта ўсвядоміць найперш жанчынам, бо грамадскія і культурныя стэрэатыпы вельмі трывалыя, і менавіта яны прымушаюць жанчыну зноў і зноў верыць у гэты аспрэчаны часам міф. Яскравым сведчаннем гэтага з'яўляецца і кніга Я.Сіпакова. Ужо яе назва падкрэслівае гендарную асіметрыю нашага грамадства: «жанчына сярод мужчын», а не (да прыкладу) «жанчыны і мужчыны». Жанчына ў свеце мужчын, жанчына ў створаным

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

мужчынамі свеце – менавіта так успрымаецца назва. Ужытае ў адзіночным ліку слова «жанчына» сведчыць пра яго абагуленасць, указвае на мужчынскае ўспрыманне жанчын як еднасці, аднолькавасці, якая ў сваю чаргу адрозніваецца ад мужчын («іншае», аб якім гаварыла С. дэ Бавуар). На самой справе, як нам ужо добра вядома з тэарэтычнай літаратуры па гендарных даследаваннях (Дж.Батлер), ніколі жанчыны такой еднасцю не з'яўляліся. Множны лік слова «мужчыны» падкрэслівае разнастайнасць у праяўленні іх характараў, указвае на тое, што яны ніколі не былі і не лічыліся еднасцю, не абагульняліся, заўсёды з'яўляліся і ўспрымаліся як асоба.

**2 Абагуленае «жанчына» ў кнізе Я.Сіпакова і «іншае» С. дэ Бавуар.**

Гераіні Я.Сіпакова рознага веку, але кожная спрабуе стварыць сваю «рэлігію жыцця», ажыццявіць сувязь са светам мужчын. Не заўсёды ўдалай аказваецца гэтая спроба. Маланка, старая вясковая кабета, «дзякуючы» вайне дажывае свой век адна, бо вайна забрала ў яе і мужа, і сына. Але вайна адбываецца не сама па сабе. Яна – вынік узаемаадносін людзей / мужчын, іх палітыкі. Старая кабета вымушана наладжваць сувязь з суседам Іллюком, які ажаніўся з яе былой нявесткай. Маланка гадуе іх дзяцей, як сваіх родных унукаў. Сусед, хоць і раўніва ўспрымае той факт, што яго дзеці больш шануюць Маланку, чым родную бабу Аўдотку, усё ж *«і падможыць, і падсобіць, калі што трэба»*: прывязе дроў, узарэ гарод, страху падлатае. Такім чынам, Іллюк узвальвае на сябе ношу загінуўшых мужа і сына Маланкі, выпраўляе памылкі вайны. Фотакарткі ў доме Маланкі выконваюць ролю іконы. Менавіта выявам мужа і сына штовечар спавядаецца кабета («Слухай, сынок»).

Я.Сіпакоў як псіхолаг даследуе ў сваіх творах уплыў першага кахання на далейшае жыццё жанчын. Так, настаўніца Таня («Знаёмыя жнівеньскія сны») без радасці сустракае новы навучальны год. Доўгае чаканне «свайго адзінага», які быў бы падобны на школьнага настаўніка, у якога Таня закахалася яшчэ ў восьмым класе, прывяло да таго, што дзяўчына ўвогуле згубіла надзею на замужжа. Прыехаўшы пасля адпачынку на месца працы, дзяўчына даведваецца, што апошні яе кавалер – кульгавы Мікіта – *«высватаў аднавокую Марылю»*. Крыху іншы шлях выбірае Ліда, гераіня апавядання «Развітанне з пісьмом». Яна на манер пушкінскай Таццяны дасылае ліст свайму каханаму, з якім вучылася ў адным класе. У лісце змешчана просьба вырашыць яе лёс, бо да яе пасватаўся іншы мужчына: *«Зразумей, я ж дзяўчына, і, не ведаючы нічога пэўнага ад цябе, мне цяжка рашыць што-кольвек самой»*. Лёс Ліды вырашаюць бацька, жаніх і каханы. Яна адно толькі збіраецца намаганнямі волі падпарадкавацца іх рашэнню, *«прымусіць сябе пакахаць іншага...»*. Ліст каханаму – вельмі смелы ўчынак напрыканцы XX стагоддзя? Ці гэта не што іншае, як двухбаковая залежнасць: з аднаго боку – ад бацькі і жаніха, з другога – ад каханага, няздольнасць самастойна вырашыць свой лёс? Пакора і паслухмянасць, падпарадкаванне волі мужчыны спрадвеку ставіліся ў заслугу дзяўчыне, гэтыя якасці праявіла і Ліда. А з імі ў душы дзяўчыны пасяліліся крыўда на каханага і, магчыма, сорам за напісанае. Пра гэта сведчыць яе ўчынак: сустрэчы праз гады, як у Анегіна з Таццянай, не адбываецца, Ліда ад'язджае з дому бацькоў напярэдадні сустрэчы былых аднакласнікаў. Гэты вобраз – прыклад добраахвотнага прыняцця ролі ахвяры, «поўнае адмаўленне суб'екта ад сябе самога і яго... згода ператварыцца ў аб'ект».

Праблему ўплыву на жыццё жанчыны першага няспраўджанага кахання

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

развівае і апавяданне «У гарадку, які называецца Учора». Але Тамара, так завуць галоўную гераіню твора, у адрозненне ад гераінь вышэй згаданых твораў, свой лёс вырашыла сама, прычым двойчы, і пры гэтым далёкая ад таго, каб лічыць сябе няшчаснай. Яна, нечакана нават для сябе самой, вельмі хутка выйшла замуж, здрадзіўшы першаму каханню – Ваню Беленькаму. І не вярнулася да яго, калі Ваня прапанаваў ёй разысціся з мужам і звязаць жыццё з ім. Тамара здолела пабудаваць з мужам адносіны такім чынам, што ніколі не пашкадавала пра свой выбар. З усяго вышэй сказанага можна зрабіць выснову, што першае каханне – гэта першая прыступка да дарослага жыцця, праверка на ўменне будаваць гендарныя адносіны. Гэтая прыступка з’яўляецца вельмі важнай, але нельга дапускаць, каб яна псавала ўсё далейшае жыццё. Калі ж так здараецца, то гэта сведчыць аб сацыяльнай інфантыльнасці і жанчыны, і мужчыны. Апавяданне «Жаночы вальс» падае крыху іншую жаночую сітуацыю. Жанчына ў творы таксама вымушана выбіраць, выбіраць паміж розумам і сэрцам. У выніку чаго яна пачынае прыстасоўвацца, наладжваць сувязі з мужчынамі, якія «не нясуць пагрозы яе ўнутранаму «я» (С. дэ Бавуар), з якімі можна сябраваць. Замужняя Надзя на курорце запрашае на танец Лазаковіча і амаль увесь адпачынак праводзіць у яго кампаніі, распавядаючы пра сваё жыццё. Але некалькі першых дзён яна правяла з Іванам Аляксеевічам: *«яны разам спускаліся да крыніцы, пілі з аднаго кубка мінеральную ваду, разам хадзілі ў сталоўку, на танцы»*. Як паведаміла перад ад’ездам Лазаковічу Надзя, Іван Аляксеевіч нагадаў ёй былога каханага. Таму яна адразу «кінулася» да яго, а потым успомніла горкі вопыт патурання сэрцу і пачуццям, які ледзь не каштаваў ёй сям’і, і стала пазбягаць Івана Аляксеевіча. Сяброўства з Лазаковічам не нясе ёй небяспекі, яна не можа ў яго закахацца і гэтым разбурыць сваё даволі ўтульнае жыццё. Надзя ўспрымае Лазаковіча як надзейную сяброўку, якой можна паспавядацца, скінуць з душы цяжар і пры гэтым быць упэўненай, што больш пра гэта ніхто не даведаецца (абражанае мужчынскае самалюбства Лазаковіча – гэта ўжо тэма для іншай гаворкі). Розныя жыццёвыя сітуацыі жанчын падаюць розныя варыянты паводзін гераінь апавяданняў. Гэта дае падставу сцвярджаць, што абагуленае «жанчына» ў кнізе Я.Сіпакова не з’яўляецца «ідэнтычнасцю без сутнасці» (Дж.Батлер), а распадаецца на «жанчыны / жаноцкасці» і напаўняецца канкрэтным зместам, чым аспрэчвае назву кнігі.

**3 Жанчына-ідэал у аповесці У.Арлова «Краявід з ментолавым пахам».**

Паколькі ўяўленні мужчын пра жанчын таксама мяняюцца з цягам часу, то напрыканцы мінулага стагоддзя створаны і альтэрнатыўныя традыцыйным вобразы жанчын. Яны не столькі выяўляюць характэрныя рысы жанчыны пэўнага соцыуму, колькі прадстаўляюць фантазіі канкрэтнага аўтара адносна жанчыны, жанчыны-ідэалу. Выяўляюць нязгоду (нават пратэст) асобных мужчын з грамадскімі патрабаваннямі да жанчыны, выпрацаванымі на працягу стагоддзяў. Гэта больш смелыя і больш інтымныя жаночыя вобразы.

Яркім сведчаннем такога ўяўлення з’яўляецца аповесць У.Арлова «Краявід з ментолавым пахам». Ствараючы вобраз «сваёй жанчыны» (якая не мае ні імя, ні канкрэтнага цялеснага ўвасаблення; не прывязана да пэўнага часу і соцыуму; на якую, урэшце, не ўплывае час), я-герой малюе вобраз жанчыны універсальнай, шматаблічнай (як знешне, так і ў праяўленнях характару) і непрадказальнай. Але найгалоўнейшая яе адметнасць («ідэальнасць»), перавага над іншымі вядомымі аўтару-герою жанчынамі – яна заўсёды згодна з ім на плоцевае каханне, у якім

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

таксама паўстае даволі арыгінальнай і шматаблічнай: *«Старажытныя індыйцы ведалі ісціну: найпаўней спасцігнуць адна адну душы могуць толькі ў зліцці сваіх зямных абалонак»*. Псіхааналітыкі ў сваю чаргу сцвярджаюць, што асноўнай мэтай дарослых сексуальных адносін, мэтай усякага эратычнага імкнення з'яўляецца ўзнаўленне ўзаемаадносін з маці, эмацыя-нальнага і фізічнага саюзу, які быў паміж дзіцём і ёю падчас «даэдыпавай стадыі развіцця», такога стану, «у якім задаволены ўсе патрэбы». «Мужчына дасягае гэтага непасрэдна праз гетэрасексуальную сувязь, якая капіруе раннюю выключнасць сувязі маці і немаўляці». Мужчыну для ўзнаўлення дзіцячай сітуацыі шчасця, ідыліі, патрэбна толькі жанчына. Менавіта гэтага шукае герой У.Арлова. Жанчына больш складаная ў гэтым плане, для ўзнаўлення ідыліі, характэрнай для «даэдыпавай стадыі развіцця» ёй яшчэ патрэбна дзіця. Аўтар не ўлічвае гэтага фактару, бо ставіць на мэце зусім іншыя задачы. Ізаляванасць герояў не можа быць бясконцай, віртуальны рай патрабуе ахвяры, таму фінал аповесці трагічны.

Да «неіснуючай», «нерэальнай» жанчыны герой выяўляе рэальныя пачуцці. Акрамя страснага пачуцця кахання ў яго душы прысутнічае і пачуццё ўласніцтва. А з апошняга вынікае рэўнасць, якая з цяжкасцю ім кантралюецца. Герой раўнуе каханую не толькі да канкрэтных мужчын, а да ўсіх, якія маглі і могуць быць у яе жыцці: *«...Шмат – тых, хто здаваў і наймаў ціхую аднапакаёўку і вандраваў з Ёю...»*. Пачуццё ўласніцтва галоўнага героя, а згодна з псіхааналізам мужчын увогуле, вынікае з яго эмацыянальнай закрытасці. Вандраванні ў прасторы і часе, мноства праяўленняў жанчыны гарантуюць працягласць мужчынскага пачуцця, вернасці, а таксама сімвалізуюць спрадвечную цягу мужчын да «разнастайнасці» ў інтымных адносінах / праяўленнях, пошуку. Гэта, да ўсяго, паказчык творчай натуры, якім і з'яўляецца я-герой аповесці.

### 4 Тоеснасць паняццяў «ідэальнасць» і «сексуальнасць» у дачыненні да галоўнай гераіні аповесці У.Арлова.

Я-герой аповесці, у адрозненне ад О.Вайнінгера, які праз характар адной жанчыны тлумачыць усіх астатніх, хоча сабраць якасці ўсіх жанчын у адной, і толькі тады яму не будзе з ёю сумна, за такую «віртуальную» жанчыну ён гатовы аддаць (і аддае) жыццё. Сярод рэальных жанчын герой твора такога ідэалу не знайшоў. У.Арлоў, як і О.Вайнінгер («Фізічна і псіхічна, усёй сваёй сутнасцю яна (жанчына – Т.Ф.) – не што іншае, як менавіта сама сэксуальнасць».), робіць акцэнт на сексуальнасці жанчыны, і абодва адмаўляюць ёй у «духоўнасці, разумнасці, лагічнасці». Але жаночая сексуальнасць для О.Вайнінгера – загана жанчыны, якая дае падставу лічыць жанчыну не ў поўнай меры чалавекам (паняцці чалавек і мужчына ў дадзеным выпадку тоесныя). У.Арлоў наадварот лічыць сексуальнасць жанчыны яе найлепшай якасцю, хоць апошняя можа стацца згубнай для мужчыны. Але сексуальнасць з'яўляецца адной з далёка не самых горшых мужчынскіх якасцей. Пацвердзім гэтую выснову радкамі з кнігі ўжо згаданай намі К.Хорні (раздзел «Недавер паміж поламі»): «Мы ведаем альбо невыразна, падсвядома адчуваем, што моцнае пачуццё, страсць можа вывесці з раўнавагі, прывесці да экстазу, прымусіць чалавека адмовіцца ад вельмі многага, ад сябе самога ўключна, карацей, азначае скачок у бязмежнае. Пагэтаму сапраўдная страсць надзвычай рэдкая». Далей аўтарка зазначае, што «мы (у дадзеным тэксце займеннік «мы» ўбірае ў сябе прадстаўнікоў абодвух полаў – Т.Ф.) імкнемся быць стрыманымі і заўсёды гатовыя да адступлення, падпарадкоўваючыся, па-магчымасці, інстынкту

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

самазахавання. Мы, натуральна, баімся згубіць сябе ў іншым чалавеку. Пагэтаму з каханнем адбываецца тое ж, што і з адукацыяй, і з псіхааналізам: усе лічаць сябе знаўцамі, але сапраўдных – нямнога. Ніхто не хоча заўважаць таго, як мала ён дае іншаму, але тым не менш кожны схільны бачыць гэту пазіцыю «самаабароны» ў партнёры: «Ты не кахаў (не кахала) мяне па-сапраўднаму». Я-герой аповесці У.Арлова «Краявід з ментолавым пахам» якраз і пераходзіць мяжу самазахавання, таму аповесць заканчваецца, з пункту гледжання чалавека бясстраснага, які кіруецца адно розумам, трагічна. Сам жа герой наўрад ці з такім бы меркаваннем пагадзіўся, як і многія з тых закаханых, што, ахопленыя страсцю, ахвяруюць жыццём дзеля кахання. Сусветная мастацкая літаратура прадстаўлена мноства такіх прыкладаў.

У заключэнне зазначым, што гендарная асіметрыя ў аповесці У.Арлова падкрэслена псіхалагічная, а не сацыяльная: ствараючы вобраз ідэальнай / універсальнай жанчыны, аўтар сцвярджае, што такой яна павінна быць для мужчыны (галоўнага героя), а не сама па сабе – «іншае» ў адносінах да мужчыны (С. дэ Бавуар). На думку Ж.Бадрыяра, «пазбаўленьне Іншага» ёсць «найгоршае адчужэньне»: «Гэта вымушае выраблять Іншага пры яго адсутнасці, і такім чынам быць увесь час рэфэрэнцыйна павязаным на сабе самым і сваім вобразе».

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ